**19.** Прачытайце вершаваныя радкі М. Хведаровіча. У якім склоне ўжыта выдзеленае слова?

*Рассыпаў снежаньскі світанак*
*Срабрысты іней па зямлі.*
***Сняжку** падкінуў ён на ганак,*
*Марозам лужыны зашкліў.*

**А)** у назоўным склоне.
**Б)** у родным склоне.
**В)** у давальным склоне. **Г)** у вінавальным склоне. **Д)** у творным склоне.

---

**20.** Дапоўніце народнае выслоўе:

*У студзені і лютым два сябры: мароз і … .*

**А)** адліга. **Б)** сонца. **В)** завея. **Г)** непагадзь. **Д)** цішыня.

---

**21.** Дадзены назоўнікі:

*1) трясогузка; 2) клёст; 3) мухоловка; 4) зяблик.*

Падбярыце адпаведнікі ў рускай мове:

*а) валасянка; б) берасцянка; в) крыжадзюб; г) пліска.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б. **Д)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-а.

---

**22.** Якія з дадзеных гукаў маюць адпаведныя мяккія гукі?

*1) [ш], 2) [м], 3) [р], 4) [ф], 5) [ч].*

**А)** усе дадзеныя гукі. **Б)** няма з дадзеных такіх гукаў.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

---

**23.** Каснік – гэта … .

**А)** вузкая палоска тканіны; стужка, якую ўплятаюць у касу.
**Б)** скудлачаная пасма валасоў, воўны.
**В)** засцерагальны галаўны ўбор у выглядзе шлема.
**Г)** чалавек, які косіць траву.
**Д)** травяністая расліна з доўгімі мечападобнымі лістамі і вялікімі кветкамі жоўтага, сіняга або фіялетавага колеру.

---

**24.** Па-руску гавораць: *“Жарить (мясо, горох, семечки)”*. А як сказаць правільна па-беларуску?

**А)** жарыць (мяса, гарох, семкі). **Б)** скварыць (мяса), паліць (гарох, семкі).
**В)** пячы (мяса, гарох, семкі). **Г)** смажыць мяса, пражыць (гарох, семкі).
**Д)** смажыць (мяса), жарыць (гарох, семкі).

---


Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»


220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/


КОНКУРС


Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 1. Тыраж 27700 экз. 2022 г.


# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2022»

*Чацвер, 17 лютага 2022 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Уважліва прачытайце народную загадку.

*Хвост з узорамі,*
*Боты са шпорамі,*
*Раніцаю ўстае,*
*Гучна песні пяе.*

Хто гэта?

**А)** бусел. **Б)** шпак. **В)** дзяцел.
**Г)** певень. **Д)** індык.

---

**2.** Прачытайце скорагаворку:

*Жвавы вожык жыва жуку пашыў кажух.*

Колькі назоўнікаў, ужытых у скорагаворцы, маюць два склады?

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**3.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі П. Панчанкі. Колькі назваў птушак сустрэлася ў радках?

*Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае,*
*І просіць засмяглая кнігаўка піць.*
*З драздом і удодам, заранкай і пліскаю*
*Святлей, чалавечней нам жыць і любіць.*

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**4.** Вызначце з прапанаваных прыклад, у якім напісаны толькі галосныя літары.

1) й, о, у; 2) ы, ў, э; 3) ь, е, і.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма такога прыкладу. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**5.** Штодзённа чуем:

*а) родители; б) родственники; в) дядя; г) тётя.*

Падбярыце адпаведнікі ў беларускай мове:

*1) дзядзька; 2) цётка; 3) бацькі; 4) сваякі.*

**А)** а-1, б-2, в-3, г-4. **Б)** а-1, б-3, в-2, г-4. **В)** а-2, б-1, в-4, г-3.
**Г)** а-3, б-4, в-1, г-2. **Д)** а-4, б-2, в-3, г-1.

---

**6.** Мабыць, вы добра ведаеце народную заклічку.

*Дожджык, дожджык, сыпані,*
*Спёку з поля прагані.*
*Я пад ліпкай пасяджу,*
*На лісточкі пагляджу.*

Колькі дзеясловаў вы заўважылі?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**7.** Маруся дапамагала брату выконваць заданне, у якім неабходна было ў сказах дапісаць назоўнікі: *а) кошкі; б) мошкі; в) слупкі; г) дубкі.* Хлопчык напісаў:

1) У лесе лётаюць кошкі. 2) Палююць на мышак мошкі.
3) У дуброве растуць слупкі. 4) Ля дарогі ўкапалі дубкі.

Дапамажыце дзяўчынцы выправіць памылкі, дапушчаныя братам.

**А)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-б, 3-а, 4-г.
**Г)** 1-а, 2-в, 3-г, 4-б. **Д)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а.

---

**8.** Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляецца падкрэсленае слова ў вершаваных радках А. Пысіна.

*Паімчаўся ручаёк міма горкі ў лясок.*
*Ручаёк, не бяжы, свае ножкі пакажы.*

**А)** назоўнікам. **Б)** дзеясловам. **В)** прыметнікам.
**Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.

---

**9.** Колькі назоўнікаў у форме множнага ліку творнага склону ў вершаваных радках П. Глебкі?

*Травы пахнуць кветкамі,*
*Кветкі пахнуць зорамі,*
*Зоры над палеткамі –*
*Лесам і азёрамі.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

---

**10.** Выберыце з прапанаваных словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем.

*1) дарожка; 2) галубка; 3) вобраз; 4) агарод.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**11.** Якія літары ў беларускім алфавіце знаходзяцца паміж ***ш, э***?

**А)** у, ў. **Б)** д, е. **В)** з, і. **Г)** б, в. **Д)** ы, ь.

---

**12.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***ы***?

*1) д..пламат; 2) д..ялект; 3) д..каратар; 4) д..льфін.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**13.** Мікіта так хацеў хутчэй напісаць сачыненне, што забыўся паставіць у канцы кожнага сказа знак прыпынку. Колькі простых сказаў паспеў напісаць хлопчык?

*Лютуе мароз снег скрыпіць пад нагамі атулены ў белую пушыстую світку бор стаіць задуменны птушкі і звяры схаваліся ад сцюжы*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**14.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі Якуба Коласа. Колькі заўважылі слоў, у якіх літара ***я*** абазначае два гукі?

*Маладая вясна,*
*Залатая пара!*
*Будзь красна і ясна,*
*Не шкадуй нам дабра!*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**15.** Якое значэнне адпавядае народнаму выслоўю *рукі не дайшлі*?

**А)** ‘усё ўмее рабіць’. **Б)** ‘не было часу зрабіць’. **В)** ‘добра запомніць’.
**Г)** ‘вельмі рана’. **Д)** ‘не прыйсці на сустрэчу’.

---

**16.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) салаў’і; 2) сямья; 3) п’еса; 4) п’яўкі.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**17.** Прачытайце ўважліва тэкст.

*Зіма – пара асабліва цяжкая для лясных жыхароў. Для невялікіх звяркоў і птушак снег – гэта сховішча, якое надзейна бароніць ад завей і іншай непагадзі. Лісе і ваўку трэба доўга шукаць спажыву.*

*Соладка спяць зімой пад надзейнай снегавой коўдрай краты, дрэмлюць мышы-землярыйкі. Бестурботна пахрапвае ў сваёй норцы барсук. (Паводле В. Стомы.)*

Колькі простых сказаў ужыта ў тэксце?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**18.** У якіх словах з дадзеных правільна напісана прыстаўка?

*1) сбудаваць; 2) рассыпаць; 3) адшумеў; 4) паткарміць.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.